**ЗАКЛЮЧЭННЕ**
**савета па абароне дысертацый Д 01.42.04 пры Цэнтры даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі**
**па дысертацыі Косцінай Жанны Вячаславаўны**
**"Эстэтычны ідэал літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя", прадстаўленай на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук**

**1. Спецыяльнасць і галіна навукі, па якой прысуджаецца ступень**. Дысертацыя прадстаўлена на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.01.01 – беларуская літаратура.

**2. Навуковы ўклад саіскальніка ў вырашэнне даследчай праблемы з ацэнкай яе значнасці.** Упершыню ў беларускім літаратуразнаўстве комплексна ахарактарызавана мадэль эстэтычнага ідэалу літаратуры Беларусі першай паловы XIX ст. з улікам канцэптуальнага ўзроўню і мастацкай формы твораў. Абгрунтавана значэнне гісторыка-патрыятычнай тэматыкі, духоўна-хрысціянскіх і народных матываў, а таксама эмоцыі як асноватворных элементаў мастацкага твора. Вызначаны дамінуючыя формы і жанры літаратуры Беларусі першай паловы XIX ст. Асветлена роля рамантычнай іроніі як важнага эстэтычнага прынцыпу літаратуры Беларусі першай паловы XIX ст.

**3. Канкрэтныя навуковыя вынікі, за якія саіскальніку можа быць прысуджана вучоная ступень**. Вучоная ступень кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.01.01 – беларуская літаратура Косцінай Жанне Вячаславаўне можа быць прысуджана **за:**

– выяўленне генезісу і спецыфікі эстэтычнага ідэалу літаратуры Беларусі першай паловы XIX ст. на тэматычным, вобразна-выяўленчым і эмацыянальна-пафасным узроўнях;

– вызначэнне ідэалагічнага зместу, аксіялагічных дамінант і эстэтычных прынцыпаў літаратуры Беларусі першай паловы XIX ст., якія заклалі аснову перспектыўнага развіцця нацыянальнай літаратуры;

– выяўленне нацыянальнай спецыфікі эстэтычнага ідэалу літаратуры Беларусі першай паловы XIX ст., абумоўленай культурным і сацыяльна-гістарычным кантэкстам і народнай маральна-эстэтычнай канцэпцыяй чалавечага быцця;

– раскрыццё агульнакультурных кодаў і эстэтычных заканамернасцей як арыгінальных і неад'емных эстэтычных рысаў беларускай літаратуры;

– распрацоўку мадэлі эстэтычнага ідэалу літаратуры Беларусі першай паловы XIX ст. на аснове асэнсавання канцэптуальнага зместу і мастацкай формы літаратурных твораў;

– вызначэнне ролі рамантычнай іроніі як аднаго з модусаў літаратуры Беларусі першай паловы XIX ст., што прадстаўлены як тып мастацкага мыслення і аснова кампазіцыйнага мадэлявання твораў акрэсленага перыяду.

**4. Рэкамендацыі па выкарыстанні вынікаў дысертацыі.** Вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны ў працэсе распрацоўкі падручнікаў, навучальных праграм, семінараў і спецкурсаў па беларускай літаратуры для студэнтаў філалагічных спецыяльнасцей устаноў вышэйшай адукацыі, пры далейшым вывучэнні гісторыі беларускай літаратуры.

Намеснік старшыні савета доктар філалагічных навук — Я. А. Гарадніцкі

Вучоны сакратар савета кандыдат філалагічных навук — А. І. Богдан

29. 01. 2025